# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ – ПАЗНАВАЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ

## Выкарыстанне актыўных метадаў навучання на ўроках беларускай мовы



**А. В. Новік,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
Маладзечанскай СШ № 1 імя Янкі Купалы



**Т. А. Клокава,**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Маладзечанскай СШ № 1 імя Янкі Купалы

**Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў – адна з асноўных задач педагога, якая паспяхова вырашаецца пры ўмове выкарыстання аптымальных метадычных прыёмаў, форм работы, камбінавання элементаў розных адукацыйных тэхналогій (праблемнага, інтэрактыўнага, праектнага навучання, тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, педагагічных майстэрняў, рознаўзроўневага навучання, калектыўнага спосабу навучання і інш.).**

Пазнавальная дзейнасць у дыдактыцы прадстаўляецца ў выглядзе наступнай схемы: цікавасць – воля – увага – думка – пошук. Цікавасць дзіцяці – важнейшая крыніца яго актыўнасці ў пазнавальным працэсе, адзін з найбольш эфектыўных пабуджальнікаў увагі. Для арганізацыі актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў неабходна ўключэнне школьнікаў у працу ўжо ў самым пачатку ўрока. На гэтым этапе прыдатнымі можна лічыць інтэрактыўныя прыёмы навучання «Падары кветку», «Імя і жэст», «Камплімент», «Алітэрацыя імені», «Калі б я быў ...», «Памяняемся месцамі», «Завяршы фразу», «Хто адкуль», «Інтэрв'ю», «Алфавіт» і інш. Вельмі папулярныя ў вучняў прыёмы «Падары кветку» і «Камплімент»: акрамя аператыўнага ўключэння ва ўзаемадзеянне, школьнікі вучацца гаварыць адзін аднаму кампліменты, павышаюць узровень культуры вуснага маўлення. Рэалізацыю названых прыёмаў мэтазгодна звязваць з тэмай урока. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Прыметнік» (6 клас) вучні павінны зрабіць аднакласніку камплімент з выкарыстаннем 1–2 прыметнікаў; пры вывучэнні лексікі школьнікі «дораць» адзін аднаму разам з кветкай новае слова (неалагізм, мнагазначнае, прафесійнае слова, сінонім, амонім і да т. п.).

Прыём «Інтэрв'ю» можна выкарыстоўваць на этапах паведамлення тэмы ўрока і матывацыі. Так, разглядаючы тэму «Акалічнасць» (5 клас), настаўнік пры дапамозе мікрафона бярэ інтэрв'ю ў вучняў.

- ✓ **Дзе** вы любіце бавіць вольны час?
- ✓ **Куды** пойдзеце пасля заканчэння заняткаў?
- ✓ **Як** трэба паводзіць сябе на ўроку?

- ✓ **Адкуль** да цябе прыехалі госці?
- ✓ **Калі** ты атрымаеш 10 балаў?

Пытанні, на якія адказвае акалічнасць, выкарыстоўваюцца падчас інтэрв'ю; на гэта трэба звярнуць увагу школьнікаў і падвесці да фармулявання тэмы ўрока.

На этапе паведамлення тэмы «Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальным звароце» (8 клас) вучням прапануецца завяршыць наступныя фразы (прыём «Завяршы фразу»).

- ✓ Наша школа, як ...
- ✓ Урокі, як...
- ✓ У мяне такі настрой, нібы... і да т. п.

Этап мэтавызначэння – самы важны і самы складаны. На думку вядомых дыдактаў (Б. Блума, Дж. Дзьюі і інш.), неабходна даць вучню магчымасць самастойна паставіць мэты навучання, і толькі пасля гэтага настаўнік можа выбраць эфектыўныя метады для іх дасягнення [3, с. 14]. Для гэтага этапу ўрока аптымальнымі лічым прыёмы тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо «Ведаю – хачу ведаць – даведаўся», «Верныя і няверныя сцвярджэнні», «Алфавіт», «Скрынка пытанняў», «Завяршы фразу», «Бартавы журнал», «Выглядае, як... Гучыць, як...», «Выберы дыстанцыю» і інш., а таксама тэхналогіі педмайстэрняў «Самаканструкцыя» (стварэнне асацыятыўнага рада).

Прыклад выкарыстання прыёму «Алфавіт» для фармуліроўкі тэмы (5 клас, тэма «Акалічнасць»): **а**значэнне члена сказа; **к**арыстацца ў маўленні; **а**ктыўна вывучаць; **л**епш асэнсаваць ролю ў сказе; **і** ўмець ставіць пытанні; **ч**асціны мовы ў ролі члена сказа; **н**авучыцца знаходзіць у сказе; **а**дказваць на пытанні настаўніка; **с**кладаць сказы; **ц**аніць свой час; дзесяць балаў атрымаць.

Мэтай аперацыйна-пазнавальнага этапу з'яўляецца забеспячэнне ўспрымання, асэнсавання і першаснага засваення матэрыялу. Гэта працэс уключэння вучняў у калектыўную працу, практыку пераадолення цяжкасцей і выпраўлення памылак. На гэтым этапе вялікую ролю адыгрывае ўменне настаўніка пабуджаць да асэнсавання логікі і паслядоўнасці выкладання вучэбнага матэрыялу, да вылучэння ў ім найбольш важных палажэнняў.

Для асэнсавання дзецьмі матэрыялу эфектыўныя прыёмы «Кластар», «Тонкія і тоўстыя пытанні», «Інсерт» (чытанне з паметкамі), «Фішбоўн», «Двухчастковы дзённік», «Зігзаг». Павышэнню матывацыі, развіццю ўмення прагназаваць спрыяюць прыёмы «Правільныя і няправільныя сцвярджэнні», «Прагназаванае чытанне», «Дрэва прадказанняў» і інш.

Неабходнай умовай павышэння пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроку, на нашу думку, з'яўляецца вызначэнне ступені засваення матэрыялу і карэкцыя ведаў, уменняў, навыкаў. Для гэтага можна выкарыстоўваць тэсты на вызначэнне зоны бліжэйшага развіцця, а таксама інтэрактыўныя прыёмы «Лічбавы дыктант», «Муха».

Прыём «Лічбавы дыктант» дарэчны і на этапе рэфлексіі, як і прыёмы «Завяршы фразу», «Ключавое слова» (або «Тэлеграма»), «Правільныя і няправільныя сцвярджэнні», «Інтэрв'ю» і інш. Цікавы вучням, напрыклад, гульнявы прыём «Пытанне ў капелюшы»: у канцы ўрока дзеці выцягваюць з капелюша карткі з пытаннямі і заданнямі. Прывядзём прыклад па тэме «Цытата. Эпіграф» (9 клас).

- ✓ Ці з'яўляецца цытата простай мовай?
- ✓ Ці бярэцца ў двукоссе вершаваная цытата? Эпіграф?
- ✓ Незабыўныя радкі, напісаныя Якубам Коласам, поўныя любові да роднай зямлі: «....» (дапоўніце сказ).
- ✓ У якасці эпіграфа да ўрока я б узяў словы У. Караткевіча: «...»
- ✓ Я не задаволены ...
- ✓ Мне ўсё спадабалася, але ...
- ✓ Хачу пажадаць аднакласнікам: «...» (дапоўніце сказ словамі М. Багдановіча).

На этапе пастаноўкі мэт наступнага ўрока эфектыўным з'яўляецца элемент тэхналогіі педмайстэрняў – разрыў (усведамленне вучнямі непаўнаты, недасканаласці сваіх ведаў, што пабуджае да пошуку адказаў). Напрыклад, вучням 5 класа напрыканцы першага ўрока па вывучэнні тэмы «Запазычаныя словы» прапануецца тэкст аб'явы: *«Інтэрнет-магазіну «Мілленіўм» патрабуецца сейлз-мэнэджэр. Кандзідат на пасаду павінен валодаць лідэрскімі якасцямі, мець гламурны імідж, вопыт работы ў інтэрнет-прасторы»*. Падчас гутаркі высвятляецца, ці зразумелі яны, які спецыяліст патрэбны; ці знайшлі іншамоўныя словы; ці правільна яны напісаны; ці прыгожа/прыемна гучыць тэкст аб'явы і да т. п. Такім чынам дзеці прыходзяць да ўсведамлення таго, што атрыманыя на ўроку веды пра запазычаныя словы патрабуюць пашырэння, удасканальвання.

Прапануем вашай увазе **ўрок беларускай мовы «Прыметнік, прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля» (10 клас)**, пабудаванага з выкарыстаннем апісаных вышэй прыёмаў.

**Мэта:** падагульненне і сістэматызацыя ведаў вучняў аб прыметніку і прыслоўі як часцінах мовы, разрадах і ступенях параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.

**Задачы:**

- удасканальваць уменні знаходзіць у тэкстах прыметнікі і прыслоўі, утвараць ступені параўнання і правільна выкарыстоўваць іх у маўленні; рабіць марфалагічны разбор прыметніка і прыслоўя; адрозніваць формы ступеней параўнання прыметніка і прыслоўя;
- актывізаваць пазнавальную дзейнасць праз выкарыстанне актыўных і інтэрактыўных прыёмаў навучання;
- выпрацоўваць навыкі самастойнай працы, сама- і ўзаемаправеркі; выхоўваць пачуццё павагі адзін да аднаго.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, карткі, табліцы, капялюш.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

***Прыём «Давайце пазнаёмімся!»***

Вучням прапануецца да першай літары свайго імені дадаць азначэнне (Таццяна – творчая, таленавітая) і адзначыць, якой часцінай мовы яны карысталіся. (*Прыметнікам.*)

***Прыём «Закончы фразу»***

Неабходна апісаць свой настрой, стан фразай «Мне...» (добра, сумна, радасна, маркотна, весела, страшна і да т. п.) і назваць выкарыстаную часціну мовы. (*Прыслоўе.*)

*Ужыванне гэтых прыёмаў дазваляе падвесці вучняў да тэмы ўрока.*

**II. Паведамленне тэмы ўрока і мэтавызначэнне**

**Настаўнік.** Адзначце, калі ласка, што з наступнага пераліку для вас з'яўляецца новым (+) , забытым (-), добра вядомым (v) і на што б вы хацелі звярнуць увагу (!):

- ✓ агульнае граматычнае значэнне прыметніка;
- ✓ агульнае граматычнае значэнне прыслоўя;
- ✓ марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля прыметніка;
- ✓ марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля прыслоўя;
- ✓ разрады прыметнікаў па значэнні;
- ✓ разрады прыслоўяў па значэнні;
- ✓ ужыванне прыметнікаў аднаго разраду ў значэнні іншага;
- ✓ ступені параўнання якасных прыметнікаў;
- ✓ ступені параўнання якасных прыслоўяў;
- ✓ адрозненне прыметніка і прыслоўя (ужыванне ступеней параўнання).

*Такім чынам кожны вучань вызначае задачы, якія ён павінен вырашыць на ўроку.*

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап**

<u>Заўвага.</u> На ўроку дзейнічае сістэма бонусаў. У каго напрыканцы акажацца больш бонусаў, той атрымае высокую адзнаку або дадатковы бал на кантрольным тэсце.

***Прыём «Закончы фразу»*** (замест слоў у дужках стаіць шматкроп'е)

Прыметнік – гэта (самастойная) часціна мовы, якая абазначае (прымету) прадмета і адказвае на пытанні (які?), (чый?). Змяняецца (па родах) у адзіночным ліку, (ліках) і склонах. Род, (лік), (склон) прыметніка залежаць ад (назоўніка). У сказе прыметнік з'яўляецца (азначэннем) або выказнікам.

Прыслоўе – самастойная (нязменная) часціна мовы, якая абазначае прымету (дзеяння), прымету іншай (прыметы) або прадмета і адказвае на пытанні (дзе?), (куды?), (адкуль?), (калі?), (як?), (чаму?) і інш. Прыслоўі не (змяняюцца). У сказе звычайна выконваюць ролю (акалічнасці).

***Прыём «Зігзаг»***

Вучні цягнуць карткі з нумарамі (1. Дастаткова кемлівы. 2. Вельмі разумны. 3. Найбольш працавіты. 4. Досыць камунікабельны. 5. Самы адказны), фарміруюцца групы (па 5 чалавек).

<u>Заданне 1.</u> Раскажыце, на якія разрады падзяляюцца прыметнікі паводле значэння. Карыстайцеся схемай на с. 129 падручніка.

<u>Заданне 2.</u> Раскажыце, як утвараюцца ступені параўнання якасных прыметнікаў і прыслоўяў. Карыстайцеся карткай і табліцай.

*Картка*

Якасныя прыметнікі і якасныя прыслоўі (якія ўтвораны ад якасных прыметнікаў) на *-о*, *-а* ўтвараюць: вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання. Кожная ступень мае 2 формы: простую (складаецца з 1 слова) і складаную, або састаўную (складаецца з 2 слоў).

**Ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў**

| Зыходная форма | Вышэйшая ступень параўнання | | Найвышэйшая ступень параўнання | |
|---|---|---|---|---|
| | Простая форма | Састаўная форма | Простая форма | Састаўная форма |
| прыметнік | -эйш-,-ейш- | болей (больш), меней (менш) + прыметнік | най + простая форма вышэйшай ступені | самы, найбольш, найменш + прыметнік |
| вясёлы<br>! добры | весялейшы,<br>лепшы | менш вясёлы,<br>больш добры | найвесялейшы,<br>найлепшы | самы вясёлы,<br>самы добры |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| прыслоўе | -эй-, -ей- | болей (больш), меней (менш) + прыслоўе | най + простая форма вышэйшай ступені | 1) надзвычай, найбольш, найменш + прыслоўе, 2) простая форма вышэйшай ступені + за ўсё |
| весела<br>! добра | весялей<br>лепш | больш весела,<br>менш добра | найвесялей,<br>найлепш | надзвычай весела, весялей за ўсё, надзвычай добра, лепш за ўсё |

Заданне 3. Раскажыце пра якасныя прыметнікі, якія не ўтвараюць форм ступеней параўнання. Карыстайцеся матэрыялам на с. 131.

Заданне 4. Раскажыце пра разрады прыслоўяў па значэнні. Карыстайцеся схемай на с. 133.

Заданне 5. Раскажыце, як адрозніць вышэйшую ступень параўнання прыслоўя ад вышэйшай ступені параўнання прыметніка. Пры падрыхтоўцы карыстайцеся матэрыялам на с. 134.

Групы працуюць з тэкстам падручніка і індывідуальнай карткай. Кожны ўдзельнік атрымлівае асабістае заданне па адным з урыўкаў тэксту, аналізуе інфармацыю, складае апорны канспект (у выглядзе кластара, табліцы, схемы і інш.). Потым навучэнцы пераходзяць да тых, хто атрымаў такое ж заданне, абменьваюцца сваімі думкамі, выбіраюць лепшы варыянт для прэзентацыі сваёй часткі тэксту. Дадатковым заданнем можа быць складанне па ўрыўку пытанняў для праверкі, наколькі астатнія зразумелі і засвоілі матэрыял.

Пасля гэтага ўдзельнікі вяртаюцца ў свае працоўныя групы, кожны тлумачыць засвоены ім матэрыял. Такім чынам вучні атрымліваюць поўныя звесткі. Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, выносяцца на абмеркаванне класа.

Вучням прапануецца пазнаёміцца з тэстам.

1. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і яго разрадам:

| | |
|---|---|
| а) матчына хусцінка | 1) якасны |
| б) школьная сталоўка | 2) адносны |
| в) бронзавы загар | 3) прыналежны |
| г) лісіная шапка | 4) адносны, ужыты ў значэнні якаснага |
| д) родныя краявіды | 5) прыналежны, ужыты ў значэнні адноснага |

2. Устанавіце адпаведнасць паміж прыслоўем і яго разрадам паводле значэння:

| | |
|---|---|
| а) занадта | 1) часу |
| б) вечарам | 2) меры і ступені |
| в) спрасонку | 3) спосабу дзеяння |
| г) асцярожна | 4) мэты |
| д) знарок | 5) прычыны |

3. Адзначце прыслоўі, якія могуць утвараць ступені параўнання:

а) хутка
б) змалку
в) радасна
г) утраіх
д) летась

4. Формы ступеней параўнання прыметнікаў утвораны правільна:

а) больш цвярдзейшы
б) самы найрадаснейшы
в) шырэйшы
г) менш зручны
д) найлепшы

5. Памылкі ва ўжыванні выдзеленых слоў дапушчаны ў сказах:

а) Сонца **ярчэй** за Месяц.
б) Кірыл быў удвая **дужэйшы** за кожнага з нас.
в) За год дрэва вырасла **вышэй** за хату.
г) Гэта дрэва **вышэй** за хату.
д) Не было нічога **прыгажэйшага** за гэту ўсмешку.

**Настаўнік.** Ці зможаце вы адразу выканаць гэты тэст? Якое заданне выклікае цяжкасці? (*Адказы вучняў.*)

Заданне для франтальнай працы. Назавіце прыметнікі, якія не ўтвараюць ступеней параўнання або ўтвараюць толькі складаныя формы ступеней параўнання, і абгрунтуйце свой адказ.

Мяккі, новы, цёмна-сіні, халасты, разумны, добры, салодкі, працаглы, белы, бронзавы (загар), бронзавы (бюст), бусліны, лясны, лёгкі.

*Фізкультхвілінка.* Вучням прапануецца набор слоў. Калі слова з'яўляецца прыметнікам, неабходна выцягнуць рукі перад сабой, прыслоўем – папляскаць у далоні 2 разы, не прыметнікам і не прыслоўем – апусціць рукі і патрэсці імі.

Прыгожы, прыгожа, прыгажэе, па-нашаму, наш, светлы, святлей, пасвятлелы.

Заданне для самастойнай працы. Утварыце ступені параўнання ад 1 прыметніка і 1 прыслоўя (на выбар). Выдзеленыя словы даюць магчымасць атрымаць бонус.

Прыметнікі: лёгкі, мяккі, **дрэнны.**

Прыслоўі: лёгка, мякка, **дрэнна**.

*Ключ.*

Лёгкі – лягчэйшы, больш (менш) лёгкі, найлягчэйшы, найбольш (самы) лёгкі.

Лёгка – лягчэй, больш лёгка, найлягчэй, надзвычай лёгка.

Мяккі – мякчэйшы, менш (больш) мяккі, наймякчэйшы, самы мяккі.

Мякка – мякчэй, больш (менш) мякка, наймякчэй, найбольш (надзвычай) мякка.

Дрэнны – горшы, менш дрэнны, найгоршы, самы (найбольш) дрэнны.

Дрэнна – горш, менш дрэнна, найгорш, надзвычай дрэнна.

**Настаўнік.** Ці правільна ўжыта падкрэсленая форма слова?

Сённяшні ўрок роднай мовы цікавей за звычайны.

***Прыём «Лічбавы дыктант»***

Калі падкрэсленая форма слова ўжыта правільна, пастаўце лічбу 1, калі няправільна – 0. Выпраўце памылкі, каб атрымаць бонус.

Цёмныя цені даўжэй у лагчыне.
Ідзе-брыдзе Аксіння далей.
Даўней быў шмат дужэйшы народ.
Гэля прыгажэй за ўсіх у вёсцы.

*Ключ.* 0110.

**IV. Кантрольна-карэкцыйны этап**

Выкананне тэста вучнямі (5 хвілін).

*Ключ.*

1. а3, б2, в4, г5, д1.
2. а2, б1, в5, г3, д4.
3. а, в.
4. в, г, д.
5. а, г.

**V. Рэфлексія**

Вучні звяртаюцца да задач, якія ставілі на пачатку ўрока, аналізуюць вынікі сваёй работы.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры** / В. У. Бухавец [і інш.]; пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мінск: Сэр-Вит, 2006. – 208 с.
2. **Жуковіч, М. В.** Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры / М. В. Жуковіч. – Мінск: Аверсэв, 2007. – 157 с.
3. **Заир-Бек, С. И.** Развитие критического мышления на уроке: пособие для учителя / С. И. Заир-Бек, И. В. Муштавинская. – М.: Просвещение, 2004. – 175 с.